**Новости института**

- Обновлено 09.09.2020 11:53

Опубликовано 09.09.2020 09:19

Автор: ОПРИиОС

Просмотров: 545

Удзел у фестывалі "LIFFT-2020" бралі прадстаўнікі Расіі, Беларусі, Аўстраліі, Азербайджана, Германіі, Ізраіля, Літвы, Казахстана, Польшчы, Украіны, ЗША і іных краін. У межах фестываля адбыўся V Усерасійскі літаратурны конкурс, прымеркаваны да 75-годдзя Перамогі, - "Дзякуй прадзеду за Перамогу!".
Курсант 4 курса факультэта міліцыі Даніїл Свешнікаў накіраваў на конкурс празаічны твор "Партрэт прадзеда", які атрымаўся аўтабіяграфічным і амаль дакументальным. Даніїл дзеліцца ўспамінамі дзяцінства, праз расповеды сваіх продкаў аднаўляючы падзеі Вялікай Айчыннай. Твор курсанта інстытута ўдзельнічаў у намінацыі "Проза" і адзначаны сертыфікатам. Інфармацыя пра нашага курсанта змешчана таксама ў міжнародныміі літаратурным часопісе "LIFFT".

Прызнанне літаратурных здольнасцей для Даніїла Свешнікава - не першае. Восенню 2019 года ён быў прызнаны пераможцам літаратурнага конкурсу «І круціцца планета Куляшова», прысвечанага 105-годдзю з дня нараджэння Аркадзя Куляшова, адразу ў дзвюх намінацыях: «Знаёмыя незнаёмцы» і «Мая малая радзіма».

*Па інфармацыі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.*



Phoca PDF